# Абрысы

Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы запрашае 29 жніўня на ўрачыстае адкрыццё другой чаргі новай экспазіцыі «Шляхі». Яе стваральнікі імкнуліся прадставіць на якасна новым узроўні творчасць Песняра ў лёсавызначальныя для Беларусі 1920-я гады, раскрыць драматургічную спадчыну, яе ролю ў гісторыі і сучаснасці нацыянальнага тэатра, адлюстраваць жыццё паэта ў Мінску, які стаў для Купалы родным горадам з 1919-га па 1941 год. Наведвальнікі музея змогуць з дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій пазнаёміцца з рарытэтнымі прадметамі музейных калекцый, убачыць Мінск часоў паэта, здзейсніць падарожжа па яго мінскіх адрасах, наведаць інтэрактыўную зону «Хлопчык і лётчык», створаную для дзяцей.

Сёння ў Зэльве пачынаецца «Ганненскі кірмаш», які мае слаўныя традыцыі яшчэ з XVIII ст., калі ў мястэчка кіраваліся купцы з усёй Еўропы. Сёлетні двухдзённы кірмаш стане карысным для вытворцаў і аматараў народнай творчасці, спартсменаў і турыстаў. У цэнтральным сквery прадстаўлены дасягненні раённых Дамоў рамёстваў і народных майстроў, працуюць мастацка-музычная і спартыўная пляцоўкі, чакаецца майстар-клас па рэгіянальных танцах. На заўтра запланаваны тэатралізаваны паказ на галоўнай плошчы і іншыя цікавыя мерапрыемствы. Свае работы прадэманструюць таксама разьбяры па дрэве.

Упершыню ў Музеі горада Гомеля экспануюцца работы Валерыя Ражнова. На выстаўцы прадстаўлены гарадскія і марскія пейзажы, нацюрморты, партрэты касманаўтаў, прамысловыя чарцяжы, схемы, эскізы камбайнаў, станкоў, інтэр'ераў вытворчых памяшканняў, дызайнерскія распрацоўкі, фотаздымкі скульптур і інш. Валерый Ражноў як самадзейны мастак-графік працуе ў тэхніцы пастэлі. Прафесійную адукацыю атрымаў у Ленінградскім вышэйшым мастацка-прамысловым вучылішчы імя В. І. Мухінай, з 1987 года — член Саюза дызайнераў СССР. Сёння яго работы знаходзяцца ў прыватных калекцыях Германіі, Францыі, Чэхіі, Славеніі, Ізраіля, ЗША.

Гасцямі выстаўкі «Майстар, настаўнік, вучань» у Расійскім цэнтры навукі і культуры ў Мінску, якая адкрыецца 2 верасня, стануць сталічныя школьнікі. Для іх гэта будзе першы ўрок у новым навучальным годзе. У экспазіцыі сабраны творы людзей, шчыра адданых музе. Будзе прадстаўлены жывапіс і графіка Барыса і Аксаны Аракчэевых, жывапіс і батык Святланы Дубавец (выстаўляецца ўпершыню).